# Савет Еўропы і Еўрапейскі Саюз Рамачная праграма супрацоўніцтва (РПС) на 2015–2020 гг. для Арменіі, Азербайджана, Грузіі, Рэспублікі Малдова, Украіны і Беларусі



## Супрацоўніцтва з мэтай заахвочвання правоў чалавека, дэмакратыі і вяршэнства права

**Programmatic Cooperation Framework for Armenia, Azerbaijan, Georgia, Republic of Moldova, Ukraine and Belarus**

Funded by the European Union and the Council of Europe

EUROPEAN UNION

COUNCIL OF EUROPE
CONSEIL DE L'EUROPE

Implemented by the Council of Europe




Савет Еўропы і Еўрапейскі саюз (ЕС) з’яўляюцца асобнымі арганізацыямі, якія маюць розныя, але узаемадапаўняльныя ролі.

- Савет Еўропы супрацоўнічае са сваімі 47 дзяржавамі-членамі для ўмацавання правоў чалавека і дэмакратыі на кантыненце і па-за яго межамі.
- ЕС збліжае свае 28 дзяржаў-членаў у эканамічным і палітычным сэнсе шляхам ўзгаднення заканадаўства і практык у пэўных галінах палітыкі.
- ЕС стварыў ініцыятыву «Усходняе партнёрства», каб цесна супрацоўнічаць са сваімі ўсходнімі еўрапейскімі суседзямі: Арменіяй, Азербайджанам, Беларуссю, Грузіяй, Рэспублікай Малдова і Украінай.
- Гэтыя дзве арганізацыі цесна супрацоўнічаюць у галінах, у якіх яны маюць агульныя інтарэсы, менавіта ў прасоўванні правоў чалавека і дэмакратыі па ўсёй Еўропе і ў суседніх рэгіёнах.
- Супрацоўніцтва паміж Еўрапейскім Саюзам і Саветам Еўропы дазваляе кожнай арганізацыі атрымаць выгаду з моцных бакоў іншай, тым самым падтрымліваючы працу адзін аднаго.

## 47 дзяржаў-членаў Савета Еўропы

- Албанія, Андора, Арменія, Аўстрыя, Азербайджан, Бельгія, Боснія і Герцагавіна, Балгарыя, Харватыя, Кіпр, Чэхія, Данія, Эстонія, Фінляндыя, Францыя, Грузія, Германія, Грэцыя, Венгрыя, Ісландыя, Ірландыя, Італія, Латвія, Ліхтэнштэйн, Літва, Люксембург, Мальта, Рэспубліка Малдова, Манака, Чарнагорыя, Нідэрланды, Нарвегія, Польшча, Партугалія, Румынія, Расійская Федэрацыя, Сан-Марына, Сербія, Славакія, Славенія, Іспанія, Швецыя, Швейцарыя, Былая Югаслаўская Рэспубліка Македонія, Турцыя, Украіна, Вялікабрытанія.

## 28 дзяржаў-членаў Еўрапейскага Саюза

- Аўстрыя, Бельгія, Балгарыя, Харватыя, Кіпр, Чэшская Рэспубліка, Данія, Эстонія, Фінляндыя, Францыя, Германія, Грэцыя, Венгрыя, Ірландыя, Італія, Латвія, Літва, Люксембург, Мальта, Нідэрланды, Польшча, Партугалія, Румынія, Славакія, Славенія, Іспанія, Швецыя, Вялікабрытанія.




## ШТО ТАКОЕ РПС?

У красавіку 2014 года Еўрапейскі саюз (ЕС) і Савет Еўропы (СЕ) ўзгаднілі ў Заяве аб намерах, што мэтанакіраваныя дзеянні па супрацоўніцтве з Арменіяй, Азербайджанам, Грузіяй, Рэспублікай Малдова, Украіна і Беларуссю – краінамі-удзельнікамі ініцыятывы ЕС «Усходняе партнёрства» – будуць рэалізоўвацца згодна з «Рамачнай праграмай супрацоўніцтва» (РПС).

Гэтыя меры па супрацоўніцтве будуць садзейнічаць умацаванню патэнцыялу краін Усходняга партнёрства, якія з'яўляюцца дзяржавамі-членамі Савета Еўропы, за выключэннем Беларусі; рэалізацыі ўнутраных рэформаў, каб наблізіць гэтыя краіны да стандартаў Савета Еўропы і Еўрапейскага Саюза ў галіне правоў чалавека, дэмакратыі і вяршэнства права.

## ЯК ДОЎГА БУДЗЕ ПРАЦЯГВАЦЦА РПС?

РПС была падпісана ў снежні 2014 года і будзе ажыццяўляцца ў два этапы: у 2015–2017 і 2018–2020 гадах. Сярэднетэрміновая ацэнка будзе праведзена ў 2017 годзе, а канчатковая ацэнка – у 2020 годзе.

## КОЛЬКІ БУДЗЕ КАШТАВАЦЬ РПС?

Бюджэт першага этапу рэалізацыі (2015–2017 гг.) складае 33800000 еўра. РПС фінансуецца на 90% Еўрапейскім саюзам і на 10% Саветам Еўропы. Яна рэалізуецца Саветам Еўропы.

# ШТО БУДЗЕ ЗРОБЛЕНА Ў РАМКАХ РПС?

Еўрапейскім саюзам былі вызначаны пяць прыярытэтных галінаў (або «тэм») супрацоўніцтва ў рамках РПС. У гэтых пяці тэмах ёсць 15 падтэм, якія прадугледжваюць 50 дзеянняў для канкрэтных краін і рэгіёнаў.

## Тэма I: Абарона і заахвочванне правоў чалавека

- Умацаванне еўрапейскіх стандартаў па правах чалавека на рэгіянальным і нацыянальным узроўнях
- Абарона правоў нацыянальных і этнічных меншасцяў
- Заахвочванне роўнасці і чалавечай годнасці
- Садзейнічанне адукацыі ў галіне правоў чалавека і дэмакратычнай грамадзянскасці

## Тэма II: Забеспячэнне справядлівасці

- Умацаванне незалежнасці і эфектыўнасці правасуддзя
- Умацаванне канстытуцыйнага правасуддзя
- Садзейнічанне пенітэнцыярнай рэформе (ад карнага да рэабілітацыйнага падыходу)

## Тэма III: Барацьба з пагрозамі вяршэнству права

- Барацьба з карупцыяй і ўмацаванне сістэмы дзяржаўнага кіравання / барацьбы з адмываннем грошай
- Дзеянне крымінальнага правасуддзя ў дачыненні да кібер-злачыннасці

## Тэма IV: Рашэнне праблем інфармацыйнага грамадства

- Паляпшэнне свабоды, незалежнасці, плюралізму і разнастайнасці СМІ
- Інфармацыйнае грамадства і кіраванне Інтэрнэтам
- Умацаванне права на абарону дадзеных

## Тэма V: Садзейнічанне дэмакратычнаму кіраванню

- Дапамога ў правядзенні выбараў: рэфармаванне выбарчага заканадаўства і практыкі
- Умацаванне інстытуцыйных рамак для мясцовага самакіравання

Генеральны сакратар і Камітэт міністраў Савета Еўропы вызначылі прыярытэтныя галіны для супрацоўніцтва з дзяржавамі-членамі, і яны адлюстраваныя ў планах дзеянняў гэтых краін.

Савет Еўропы мае мультыарганізацыйныя перавагі і праз сваю Парламенцкую Асамблею і Кангрэс мясцовых і рэгіянальных органаў улады зможа залучаць да РПС розныя інстытуты і зацікаўленыя бакі на нацыянальным, рэгіянальным і мясцовым узроўнях ва ўсіх краінах Усходняга партнёрства.

Усе дзеянні ў рамках РПС будуць тычыцца шматбаковых праблем, такіх як стратэгія дасягнення гендэрнай роўнасці, абарона правоў меншасцяў і забеспячэнне інклюзіўнага ўдзелу грамадзянскай супольнасці ў рэалізацыі РПС.



## ЯК ПРАЦУЕ РПС?

Дзеянні ў рамках РПС, як у канкрэтных краінах, так і на рэгіянальным узроўні, былі распрацаваныя ў цесным супрацоўніцтве з нацыянальнымі зацікаўленымі бакамі ў рамках планаў дзеянняў для канкрэтных краін Савета Еўропы. Планы дзеянняў падрыхтаваныя на аснове высноваў і рэкамендацый органаў па маніторынгу Савета Еўропы і ў адпаведнасці з нацыянальнымі праграмамі рэформаў.

Дзеянні ў рамках РПС забяспечаць маштабны і значны аб'ём ведаў па ўмацаванні патэнцыялу установ краін Усходняга партнёрства ў справе правядзення ўнутраных рэформаў і наблізяць іх да стандартаў Савета Еўропы ў галіне правоў чалавека, дэмакратыі і вяршэнства права. Гэта будзе зроблена з дапамогай розных мерапрыемстваў: канферэнцый, семінараў, рабочых груп, сетак, аналітычных справаздач і трэнінгаў пад кіраўніцтвам супрацоўнікаў Савета Еўропы і міжнародных экспертаў.

Суб'ектамі, якія будуць прымаць удзел, з'яўляюцца нацыянальныя зацікаўленыя бакі, якія граюць вырашальную ролю ў ажыццяўленні рэформаў: парламенты, органы дзяржаўнай улады на ўсіх узроўнях (міністэрствы, адказныя за юстыцыю, фінансы, унутраныя справы, ахову здароўя, адукацыю, працу і сацыяльную абарону, а таксама дзяржаўнае кіраванне), дзяржаўныя ўстановы ў адпаведных галінах, такіх як барацьба з карупцыяй і барацьба з адмываннем грошай, пракуроры, супрацоўнікі праваахоўных органаў, пенітэцыярныя службы, цэнтральныя і мясцовыя выбарчыя камісіі, упаўнаважаныя па правах чалавека, судзейскія супольнасці, судовыя органы самакіравання, спецыялісты ў галіне права, сродкі масавай інфармацыі, мясцовыя і рэгіянальныя органы ўлады, няўрадавыя арганізацыі, навуковыя колы, а таксама шырокая грамадскасць.

## Органы па маніторынгу

Органы па маніторынгу Савета Еўропы складаюцца з незалежных экспертаў, якія сочаць за выкананнем канвенцый Савета Еўропы дзяржавамі-членамі і выдаюць рэкамендацыі. Гэтыя органы ўключаюць у сябе: Групу па барацьбе з карупцыяй (ГРЭКА); Еўрапейскую камісію па эфектыўнасці правасуддзя (ЕКЭП); Еўрапейскі камітэт па папярэджанні катаванняў і бесчалавечнага або зневажаючага годнасць абыходжання або пакарання (ЕКПК); Групу экспертаў па барацьбе з гандлем людзьмі (ГРЭТА) Камітэт экспертаў Савета Еўропы па ацэнцы мераў барацьбы з адмываннем грошай і фінансаваннем тэрарызму (МАНІВЕЛ); Кансультатыўны камітэт Рамачнай канвенцыі аб абароне нацыянальных меншасцяў (РКНМ); Еўрапейская камісія супраць расізму і нецярпімасці (ЕКРН); Канвенцыя аб прадухіленні і барацьбе з гвалтам у адносінах да жанчын і гвалтам у сям'і (GREVIO); таксама сюды ўваходзіць Еўрапейскі суд па правах чалавека.




©pbombaert/Shutterstock.com

## ХТО КААРДЫНУЕ РПС?

- Будзе створаны пастаянны механізм каардынацыі паміж Саветам Еўропы, Еўрапейскім Саюзам, мясцовымі офісамі Савета Еўропы, прадстаўніцтвамі Еўрапейскага Саюза і нацыянальнымі каардынатарамі РПС для забеспячэння ўсёабдымнай каардынацыі паміж Саветам Еўропы, Еўрапейскім Саюзам, нацыянальнымі зацікаўленымі бакамі і партнёрамі, а таксама іншымі міжнароднымі арганізацыямі.

- Гэта дазволіць забяспечыць сінэргію з іншымі існуючымі і планаванымі рэгіянальнымі дзеяннямі і дзеяннямі, якія тычацца канкрэтных краін у краінах Усходняга партнёрства, і атрымаць адчувальныя вынікі і ўплыў РПС на канчатковых бенефіцыяраў і шырокую грамадскасць.

## ЦІ ВЫНІКІ УСТОЙЛІВЫЯ?

- Права нацыянальных зацікаўленых бакоў на працэс рэформаў будзе мець вырашальнае значэнне для працяглага ажыццяўлення РПС, арыентаванага на вынік. Дзеянні ў рамках РПС накіраваныя на развіццё і паляпшэнне нацыянальных прававых рамак, нацыянальных інстытуцыйных магчымасцяў, а таксама на павышэнне прафесійных навыкаў і ведаў партнёраў і нацыянальных зацікаўленых бакоў. Устойлівасць будзе дасягнута за кошт павышэння інстытуцыйнага патэнцыялу і падрыхтоўкі нацыянальных кадраў.

- РПС будзе садзейнічаць нарошчванню ведаў і патэнцыялу нацыянальных удзельнікаў, каб яны маглі спрыяць дасягненню мэтаў сярод сваіх калегаў у краіне і рэгіёне таксама пасля заканчэння РПС.

# ДЗЕ Я МАГУ ЗНАЙСЦІ БОЛЬШ ПАДРАБЯЗНУЮ ІНФАРМАЦЫЮ?

- Сайт Рамачнай праграмы супрацоўніцтва Савета Еўропы Еўрапейскага Саюза:
  **http://eap-pcf-eu.coe.int**
- Сайт Усходняга партнёрства Еўрапейскага Саюза:
  **www.coe.int/en/web/programmes**
- Савет Еўропы: сайт Упраўлення Генеральнага дырэктарата па праграмах:
  **www.eeas.europa.eu/eastern**
- Facebook
  **www.facebook.com/pages/CoE-EU-Eastern-Partnership-PCF**
- Twitter
  **https://twitter.com/CoeEapPCF**
- Электронная пошта:
  **pcf@coe.int**

PREMS 088715 – Photos: Council of Europe

BEL

The Council of Europe is the continent's leading human rights organisation. It comprises 47 member states, 28 of which are members of the European Union. All Council of Europe member states have signed up to the European Convention on Human Rights, a treaty designed to protect human rights, democracy and the rule of law. The European Court of Human Rights oversees the implementation of the Convention in the member states.

**www.coe.int**

The European Union is a unique economic and political partnership between 28 democratic European countries. Its aims are peace, prosperity and freedom for its 500 million citizens – in a fairer, safer world. To make things happen, EU countries set up bodies to run the EU and adopt its legislation. The main ones are the European Parliament (representing the people of Europe), the Council of the European Union (representing national governments) and the European Commission (representing the common EU interest).

**http://europa.eu**

Funded
by the European Union
and the Council of Europe

EUROPEAN UNION

COUNCIL OF EUROPE
CONSEIL DE L'EUROPE

Implemented
by the Council of Europe